УДК 811.161.3

# СІСТЭМА НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ АРФАГРАФІІ ВА ЎЗАЕМАСУВЯЗІ З РАЗВІЦЦЁМ КУЛЬТУРЫ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ У ВУЧЭБНЫМ ДАПАМОЖНІКУ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (5 КЛАС)

**Г. М. Валочка,**
доктар педагагічных навук, прафесар,
загадчык лабараторыі гуманітарнай адукацыі
Нацыянальнага інстытута адукацыі;

**В. У. Зелянка,**
кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
намеснік дырэктара па навукова-даследчай рабоце
Нацыянальнага інстытута адукацыі

(Рэспубліка Беларусь)
**e-mail:** labgum@tut.by

У статті розглянуто проблему навчання орфографії білоруської мови у взаємозв’язку з розвитком культури мовлення учнів. Автори обґрунтовують доцільність такого підходу під час навчання білоруської мови в закладах загальної середньої освіти Республіки Білорусь і показують його впровадження в новому навчальному посібнику з білоруської мови для 5 класу.

**Ключові слова:** орфографія; культура мови; предметні компетенції; принципи відбору змісту навчання; система вправ.

**Пастаноўка праблемы.** У сучасным інфармацыйным грамадстве становіцца ўсё больш вызначальнай роля пісьмовай камунікацыі, якая забяспечвае функцыянаванне розных сфер інтэлектуальнай дзейнасці чалавека. Беларуская мова як мова тытульнай нацыі і адна з дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь абслугоўвае камунікатыўныя патрэбы асобы і грамадства, у тым ліку звязаныя з пісьмовымі зносінамі. Гэтым абумоўлена неабходнасць захавання адзінства арфаграфічных норм, чым у значнай ступені забяспечваецца стабільнасць у сферы моўнай камунікацыі. Таму навучанне пісьмоваму маўленню (а значыць і пісьму як віду маўленчай дзейнасці) не можа ажыццяўляцца ў адрыве ад арфаграфічнага аспекту. Аднак,

нягледзячы на тое што фарміраванню арфаграфічных ведаў, уменняў і навыкаў вучняў надаецца значная ўвага ў тэорыі і практыцы навучання беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, праблема павышэння арфаграфічнай пісьменнасці і сёння застаецца актуальнай.

**Аналіз апошніх даследаванняў і публікацый.** Тэарэтычныя і практычныя праблемы беларускай арфаграфіі, пытанні правапіснай нарматыўнасці даследуюцца ў работах мовазнаўцаў З. І. Бадзевіч, В. І. Іўчанкава, У. І. Куліковіча, А. А. Лукашанца, А. І. Падлужнага, Л. І. Сямешка і інш. На сучасным этапе развіцця лінгваметодыкі вызначаны лінгвадыдактычныя асновы навучання беларускай арфаграфіі ў 5-м класе (З. М. Сазоненка), распрацавана комплексная методыка навучання беларускай арфаграфіі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі (Н. М. Антановіч). Асобным аспектам методыкі навучання беларускай арфаграфіі прысвечаны публікацыі Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, У. І. Куліковіча, В. А. Ляшчынскай, В. У. Протчанкі, С. М. Якуба, М. Г. Яленскага і інш.

**Мэта артыкула** — абгрунтаваць мэтазгоднасць навучання беларускай арфаграфіі ва ўзаемасувязі з развіццём культуры маўлення вучняў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі; паказаць увасабленне гэтай ідэі ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове для 5 класа.

**Выклад асноўнага матэрыялу.** Навучанне арфаграфіі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі мае надзвычай важнае значэнне для фарміравання і развіцця камунікатыўнай культуры вучняў, паколькі засваенне арфаграфічных норм — неабходная ўмова авалодання пісьмовым маўленнем. «Не фармальная пісьменнасць школьніка з’яўляецца асноўнай задачай... школы (хаця неабходнасць яе смешна адмаўляць), — адзначаў расійскі лінгвіст і псіхолаг А. А. Лявонцьеў, — тут павінны быць закладзены асновы яго функцыянальнай пісьменнасці, яго здольнасці да паўнавартасных вусных і пісьмовых зносін. І адначасова — гэта прылада яго самаразвіцця, тое, што робіць магчымым яго самаадукацыю, сацыялізацыю, яго далейшае пазнавальнае, асобаснае, мастацка-каштоўнаснае развіццё» [2, с. 388].

Вучэбнай праграмай для 5-га класа [1] найбольшая колькасць вучэбнага часу (28 гадзін) адводзіцца на вывучэнне раздзела «Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія». Разам з тым пытанне эфектыўнасці навучання беларускаму правапісу не страчвае сваёй актуальнасці, што ў значнай ступені абумоўлена недаацэнкай маўленчага аспекту пры засваенні арфаграфічных норм беларускай мовы. У вучэбных дапаможніках традыцыйна дамінуюць практыкаванні з заданнем уставіць прапушчаныя літары, арфаграфічная работа праводзіцца часцей за ўсё на матэрыяле асобных слоў, словазлучэнняў ці сказаў і рэдка — на аснове недэфармаваных (без пропуску літар) тэкстаў. А менавіта ад метадычна прадуманай арганізацыі арфаграфічнай працы з дыдактычным матэрыялам, якая забяспечвае ўзаемазвязанае развіццё арфаграфічных і камунікатыўных уменняў і навыкаў, залежыць паспяховасць навучання беларускай мове ў цэлым, паколькі

арфаграфічная пісьменнасць з'яўляецца адным з паказчыкаў маўленчай і агульнай культуры асобы.

Згодна з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская мова», адной з задач навучання беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца засваенне сістэмы мовы, заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, норм беларускай літаратурнай мовы, развіццё ўменняў карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці. Як вядома, паміж веданнем моўных сродкаў (фанетычных, лексічных, словаўтваральных, граматычных) і авалоданнем рознымі відамі маўленчай дзейнасці (слуханне, чытанне, пісьмо, гаварэнне), акрамя адносін сродку і мэты навучання, існуюць яшчэ адносіны часткі і цэлага. Гэта значыць, што фанетычныя, лексічныя, словаўтваральныя, граматычныя ўменні і навыкі ўключаюцца ў комплексныя маўленчыя ўменні як іх неад'емныя кампаненты. Адным са складнікаў гэтага інтэгральнага комплексу з'яўляюцца арфаграфічныя веды, уменні і навыкі вучняў.

Акрамя таго, ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму навучанне арфаграфіі беларускай мовы павінна арыентавацца на пераадоленне міжмоўнай інтэрферэнцыі, у прыватнасці, на размежаванне фанетычнага прынцыпу беларускага правапісу і марфалагічнага прынцыпу рускай арфаграфіі.

Навучанне беларускай арфаграфіі ва ўзаемасувязі з развіццём культуры маўлення вучняў прадугледжвае інтэграцыю звестак з розных раздзелаў мовазнаўства (фанетыкі, арфаэпіі, марфемікі, словаўтварэння, лексікі, граматыкі), што дапаможа вучням глыбей асэнсаваць лінгвістычныя факты і карыстацца імі пры выбары правільнага напісання, створыць рэальныя магчымасці для развіцця і ўдасканалення камунікатыўных якасцей маўлення (правільнасці, чысціні, дакладнасці, лагічнасці, выразнасці, багацця, дарэчнасці).

Навучанне арфаграфіі ва ўзаемасувязі з развіццём культуры маўлення вучняў, з аднаго боку, забяспечыць паўнавартаснае засваенне імі арфаграфічнай і маўленчай тэорыі, авалоданне ўменнямі і навыкамі абапірацца на гэтую тэорыю ў працэсе пісьма, з другога боку, будзе спрыяць удасканаленню пісьменнасці ў шырокім сэнсе гэтага слова — гэта значыць развіццю ўмення правільна, дакладна, лагічна, дарэчна выкладаць думкі ў адпаведнасці з пэўнай камунікатыўнай задачай і нарматыўнымі патрабаваннямі да маўлення.

Мэта і задачы вучэбнага дапаможніка па беларускай мове для 5-га класа падпарадкаваны мэце і задачам навучання беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі (акрэслены ў канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская мова», адукацыйным стандарце, вучэбных праграмах) і канкрэтызуюцца ў межах кожнага раздзела.

Так, мэта вывучэння раздзела «Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія» — сфарміраваць у вучняў веды пра гукі і літары беларускай мовы, нормы беларускага літаратурнага вымаўлення і правапісу; навучыць правільна вымаўляць гукі,

карыстацца арфаграфічнымі правіламі пры стварэнні самастойных пісьмовых выказванняў розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Задачы навучання фанетыцы і арфаэпіі, графіцы і арфаграфіі канкрэтызуюцца ў кантэксце фарміравання і развіцця моўнай, маўленчай, камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый вучняў:

- засваенне ведаў пра гукі і літары беларускай мовы, нормы беларускага літаратурнага вымаўлення і правапісу, авалоданне арфаэпічнымі і арфаграфічнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы (**моўная кампетэнцыя**);
- развіццё навыкаў слухання, чытання, гаварэння і пісьма на аснове авалодання фанетычнай, арфаэпічнай і арфаграфічнай тэорыяй (**маўленчая кампетэнцыя**);
- фарміраванне камунікатыўных уменняў на аснове авалодання культурай вуснага і пісьмовага маўлення, развіццё ўменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў (**камунікатыўная кампетэнцыя**);
- выпрацоўка ўменняў карыстацца культуразнаўчымі звесткамі з мэтай забеспячэння паўнацэннай камунікацыі (**лінгвакультуралагічная кампетэнцыя**);
- засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін у сітуацыях вусных і пісьмовых зносін (**сацыякультурная кампетэнцыя**).

Асноўнымі структурнымі часткамі вучэбнага дапаможніка «Беларуская мова. 5 клас» з'яўляюцца тэкставы і пазатэкставы кампаненты [4, с. 220].

**Тэкставы кампанент** уключае:

а) асноўную частку: тэарэтычны (правілы) і практычны (практыкаванні) матэрыял;

б) дадатковую частку:

- лінгвістычную інфармацыю, прыведзеную ў спецыяльных рубрыках;
- тлумачальны слоўнік, у якім раскрываюцца значэнні слоў, пазначаных зорачкамі (*);
- руска-беларускі слоўнік, змешчаны пасля тэкстаў для перакладу;
- алгарытмы моўных разбораў.

**Пазатэкставы кампанент** складаецца з:

а) апарату арганізацыі засваення (пытанні, заданні, гіперспасылкі на электронныя адукацыйныя рэсурсы на базе платформы Moodle (http://e-vedy.adu.by);

б) ілюстрацыйнага матэрыялу (малюнкі, схемы, табліцы);

в) апарату арыенціроўкі (прадмова, змест, сімвалічныя абазначэнні).

Вучэбны дапаможнік складаецца з раздзелаў і параграфаў, назвы якіх адпавядаюць зместу вучэбнага прадмета «Беларуская мова», вызначанаму вучэбнай праграмай (5 клас). У вучэбным дапаможніку знаходзяць адлюстраванне ўказаныя ў вучэбнай праграме віды дзейнасці.

У канцы кожнага раздзела прадугледжваецца падагульненне і сістэматызацыя вывучанага матэрыялу шляхам выкарыстання падагульняльных пытанняў і заданняў, рэзюмэ, вылучэння асноўных палажэнняў, складання падагульняльных табліц, схем, алгарытмаў і да т. п.

Агульнаметадычнымі прынцыпамі адбору зместу навучання з’яўляюцца:

- **сістэмна-функцыянальны прынцып** (прадугледжвае цэласнае адлюстраванне ў змесце навучання ўсіх узроўняў моўнай сістэмы і характарыстыку функцыянальных магчымасцей моўных адзінак кожнага ўзроўню);
- **прынцып мінімізацыі моўнага і маўленчага тэарэтычнага матэрыялу** (патрабуе адбіраць матэрыял з улікам яго значнасці для дасягнення пастаўленых мэт і задач моўнай адукацыі);
- **камунікатыўна-рытарычны прынцып** (рэалізуецца праз забеспячэнне працэсу навучання адпаведным зместам для авалодання вучнямі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці);
- **прынцып тэкстацэнтрызму** (мае на ўвазе арганізацыю адукацыйнага працэсу на аснове тэксту: тэкст разглядаецца ў якасці мэты, зместу і выніку навучання);
- **прынцып навучання мове як феномену культуры** (грунтуецца на выкарыстанні ў якасці дыдактычнага матэрыялу нацыянальна маркіраваных моўных адзінак, якія перадаюць адметнасць беларускай моўнай карціны свету, а таксама культуразнаўчых тэкстаў, што знаёмяць вучняў з гісторыяй і культурай Беларусі: нацыянальнымі каштоўнасцямі, звычаямі і традыцыямі, рысамі нацыянальнага характару, выдатнымі дзеячамі мастацтва, навукі, гісторыі);
- **прынцып культурна-моўнага дыялога** (вызначае два напрамкі навучання беларускай мове ў дыялогу культур: 1) дыялог на моўным узроўні, звязаны з выяўленнем адметнага і агульнага ў беларускай, рускай і іншых мовах; 2) дыялог на культуралагічным узроўні, заснаваны на спасціжэнні вучнямі каштоўнасцей іншых культур пры навучанні беларускай мове).

Вучэбны матэрыял ў дапаможніку прадстаўлены ў выглядзе:

- тэкстаў правіл;
- табліц, схем;
- рубрык («Успамінаем вывучанае», «Гавары і пішы правільна», «Скарбы мовы»);
- сістэмы практыкаванняў;
- гіперспасылак на электронныя адукацыйныя рэсурсы (http://e-vedy.adu.by).

З мэтай забеспячэння пераемнасці ў навучанні беларускай мове паміж I і II ступенямі агульнай сярэдняй адукацыі пры вывучэнні правіл, зместавае «ядро» якіх было засвоена вучнямі ў пачатковай школе (правапіс галосных **о**, **э**, **а**; **е**, **ё**, **я**; парных звонкіх і глухіх зычных і інш.), прадугледжана паўтарэнне вывучанага матэрыялу шляхам:

- выканання практыкаванняў, у якіх патрабуецца пракаменціраваць правапіс выдзеленых у тэксце літар (з апорай на веды і ўменні, сфарміраваныя ў пачатковай школе);
- увядзення «правіланакіраванай» рубрыкі «Успамінаем вывучанае», якая дазваляе актуалізаваць веды па пэўнай тэме (вучням прапануецца запоўніць

«белыя плямы» ў тэксце правіла, устанавіць адпаведнасць паміж пунктамі правіла і прыкладамі напісанняў, запоўніць прабелы ў схемах і да т. п.).

**Сістэма практыкаванняў**, накіраваных на засваенне вучэбнага матэрыялу, прадугледжвае паступовае ўскладненне заданняў: ад **прапедэўтычных практыкаванняў** (узнаўленне вывучанага матэрыялу, выкананне падрыхтоўчых заданняў) да **практыкаванняў-ілюстрацый** (аналіз прапанаванага дыдактычнага матэрыялу: слоў, словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў), **замацавальных практыкаванняў** (тлумачэнне арфаграм, падбор уласных прыкладаў, выкарыстанне вывучаных моўных з'яў у звязным маўленні), **творчых практыкаванняў** (складанне словазлучэнняў і сказаў, пераканструяванне прыкладаў, выкарыстанне слоў з пэўнымі арфаграмамі ў творчых работах).

Выкарыстанне ў якасці дыдактычнага матэрыялу тэкстаў — урыўкаў з твораў мастацкай літаратуры — спрыяе стварэнню на вучэбных занятках развіццёвага маўленчага асяроддзя: рашэнне моўных і маўленчых задач на аснове тэксту дазваляе фарміраваць у вучняў правільнасць маўлення (авалоданне моўнымі і маўленчымі нормамі) і камунікатыўную мэтазгоднасць маўлення (развіццё і ўдасканаленне такіх камунікатыўных якасцей маўлення, як дакладнасць, лагічнасць, чысціня, багацце, выразнасць, дарэчнасць).

Заданні да тэкстаў скіраваны не толькі на выпрацоўку вучэбна-моўных уменняў і навыкаў вучняў (фанетычных, арфаграфічных, лексічных і інш.), але і на фарміраванне **чытацкай пісьменнасці** — здольнасці разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, разважаць пра іх і займацца чытаннем для рэалізацыі сваіх мэт, пашыраць свае веды і магчымасці, удзельнічаць у сацыяльным жыцці (згодна з міжнароднымі даследаваннямі PISA) [3]. Такія заданні патрабуюць:

- знайсці і выбраць інфармацыю;
- інтэграваць і інтэрпрэтаваць паведамленне тэксту;
- асэнсаваць і ацаніць змест або форму тэксту.

Першыя два ўменні падразумяваюць апору на тэкст, трэцяе патрабуе апоры на пазатэкставыя веды.

Моўную аснову асобных практыкаванняў складаюць фразеалагізмы, прыказкі, прымаўкі (рубрыка «Скарбы мовы»), што спрыяе ўзмацненню семантычнага аспекту пры навучанні беларускай мове, а таксама засваенню вучнямі «закадзіраваных» у фраземах і парэміях звестак пра гісторыю, духоўнае жыццё, этнічны побыт, характар беларускага народа.

Развіццю культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў спрыяе рубрыка «Гавары і пішы правільна», у якой акцэнтуецца ўвага на нарматыўным вымаўленні пэўных гукаў, спалучэнняў гукаў, слоў, што дазваляе прадухіліць арфаграфічныя памылкі, абумоўленыя ўплывам фанетычных асаблівасцей рускай мовы, ненарматыўнай пастаноўкай націску, а таксама арфаэпічныя памылкі, што ўзнікаюць пад уплывам «нефанетычных» напісанняў.

**Высновы і перспектывы далейшых даследаванняў.** Такім чынам, навучанне беларускай арфаграфіі ва ўзаемасувязі з развіццём культуры маўлення вучняў дазваляе падпарадкаваць працэс моўнай адукацыі стратэгічнай мэце — фарміраванню ў вучняў сістэмы ведаў пра беларускі правапіс і ўменняў карыстацца гэтымі ведамі пры стварэнні самастойных выказванняў. Сістэмнае навучанне беларускаму правапісу забяспечвае арфаграфічная работа на аснове тэксту, што стварае ўмовы для фарміравання ў вучняў правільнасці і камунікатыўнай мэтазгоднасці маўлення.

Прапанаваная ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове для 5-га класа сістэма арфаграфічных практыкаванняў адкрывае перспектыву для авалодання вучнямі арфаграфічнымі нормамі як нормамі культуры маўлення, развіцця ўменняў звязна, лагічна, дакладна, выразна выкладаць думкі ў адпаведнасці з пэўнай камунікатыўнай задачай і нарматыўнымі патрабаваннямі да маўлення.

## Використані джерела


1. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская мова і літаратура. V–IX класы. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2017. — 118 с.
2. Леонтьев А. А. Язык и речевая деятельность в общей и педагогической психологии: избр. психологические труды / А. А. Леонтьев. — М.: Моск. психолого-социальный ин-т; Воронеж: МОДЭК, 2001. — 448 с.
3. Основные результаты международного исследования образовательных достижений учащихся PISA-2009: аналитический отчет / под науч. ред. Г. С. Ковалевой. — М.: МАКС Пресс, 2012. — 176 с.
4. Яленскі М. Г. Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка: вучэб. дапаможнік для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / М. Г. Яленскі. — Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. — 224 с.


## References


1. Vuchebnyja pragramy dlja wstanow agul»naj sjarednjaj adukacyi z bjelaruskaj i ruskaj movami navuchannja. Bjelaruskaja mova i litaratura. V–IX klasy. — Minsk: Nac. in-t adukacyi, 2017. — 118 s.
2. Leont’ev A. A. Jazyk i rechevaja dejatel’nost’ v obshhej i pedagogicheskoj psihologii: izbr. psihologicheskie trudy / A. A. Leont’ev. — M.: Mosk. psihologo-social’nyj in-t; Voronezh: MODJEK, 2001. — 448 s.
3. Osnovnye rezul’taty mezhdunarodnogo issledovanija obrazovatel’nyh dostizhenij uchashhihsja PISA-2009: analiticheskij otchet / pod nauch. red. G. S. Kovalevoj. — M.: MAKS Press, 2012. — 176 s.
4. Jaljenski M. G. Mjetodyka vykladannja bjelaruskaj movy. Suchasnaja lingvadydaktyka: vucheb. dapamozhnik dlja studentaw filal. spjecyjal»nascjej ustanow, jakija zabjaspjechvajuc» atrymannje vyshejshaj adukacyi / M. G. Jaljenski. — Minsk: Adukacyja i vyhavannje, 2005. — 224 s.

Валочка А. М., Зеленко О. В.

## СИСТЕМА ОБУЧЕНИЯ БЕЛОРУССКОЙ ОРФОГРАФИИ ВО ВЗАИМОСВЯЗИ С РАЗВИТИЕМ КУЛЬТУРЫ РЕЧИ УЧАЩИХСЯ В УЧЕБНОМ ПОСОБИИ ПО БЕЛОРУССКОМУ ЯЗЫКУ (5 КЛАСС)

В статье рассматривается проблема обучения орфографии белорусского языка во взаимосвязи с развитием культуры речи учащихся. Авторы обосновывают целесообразность такого подхода при обучении белорусскому языку в учреждениях общего среднего образования Республики Беларусь и показывают его внедрение в новом учебном пособии по белорусскому языку для 5 класса.

**Ключевые слова:** орфография; культура речи; предметные компетенции, принципы отбора содержания обучения, система упражнений.

Valochka H., Zelianko V.

## THE SYSTEM OF TEACHING OF BELARUSIAN ORGANOGRAPHY IN INTERRELATION WITH THE DEVELOPMENT OF THE SPEECH CULTURE OF PUPILS IN THE TEACHING MANUAL ON THE BELARUSIAN LANGUAGE (5TH GRADE)

Actual problems of teaching spelling of the Belarusian language are considered in connection with the development of pupils' speech culture.

The authors formulate goals and objectives of interrelated teaching spelling of the Belarusian language and development of pupils' speech culture in general secondary education in the context of the competency-based approach that provides formation and development of linguistic, speech, communicative, cultural and socio-cultural competencies of pupils.

General methodological principles of teaching content selection, such as system-functional, communicative-rhetorical ones, minimization of linguistic and speech theoretical material, text centrism, teaching language as a phenomenon of culture, a cultural and language dialogue, are characterized.

Representation of spelling material in a new textbook for 5th grade is analyzed: refreshment of the studied material in the primary school with the aim of maintaining continuity in teaching spelling; a system of exercises aimed at learning the educational material and providing a gradual complication of tasks (from propaedeutic exercises and illustrated exercises to consolidation and creative exercises).

Particular attention is drawn to the use of the text in the textbook as didactic material, nature of assignments to texts that are aimed not only at developing teaching and language skills of pupils (phonetic, spelling, lexical, etc.), but also at the development of reading literacy.

Thus, the authors emphasize that teaching spelling on a textual basis provides a systematic mastery of Belarusian spelling, which creates conditions for forming correctness and communicative expediency of pupils' speech.

**Keywords:** spelling; speech culture; subject competencies, principles of teaching content selection, system of exercises.